ПЛАЦДАРМ

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

Выпуск № 1 (52)



■ Я тут служу...

# УНІВЕРСАЛЬНЫЯ САЛДАТЫ

## Без інжынерных войскаў, якія выконваюць цэлы спектр задач, нельга ўявіць ні адну армію свету

**Яны наводзяць пераправы і масты, капаюць акопы і ствараюць лініі абароны, мініруюць і размініруюць мясцовасць... Без ваенных інжынераў не абыдзецца ніводная бітва. Надзвычай каштоўныя гэтыя спецыялісты і ў мірны час. А між іншым, інжынерыя — адна з найстарэйшых воінскіх прафесій. Яшчэ ў антычнасці інжынерамі называлі асоб, якія стваралі ваенныя машыны і кіравалі імі падчас узброеных канфліктаў.**

Вось ужо 315 гадоў інжынерныя войскі — у авангардзе Узброеных Сіл. Ваенных інжынераў упершыню пачалі рыхтаваць у «Школе пушкарскага прыказа», якую 21 студзеня 1701 года заснаваў Пётр I. Сёння дыплом воіна-інжынера можна атрымаць у Ваеннай акадэміі і на ваенна-тэхнічным факультэце БНТУ, а стаць афіцэрам адной з найстарэйшых воінскіх прафесій — у адпаведнай вайсковай часці, якіх у краіне багата. У адну з іх — у 7-ы Торуньскі ордэнаў Аляксандра Неўскага і Чырвонай Зоркі інжынерны полк — накіраваліся карэспандэнты «Звязды». Тут, у Барысаве, з дапамогай вайскоўцаў і спасцігалі інжынерную навуку.

### НА АКОП — ПАЎГАДЗІНЫ

Першае, што адрознівае ваенных інжынераў ад іншых вайсковых спецыялістаў, — тое, што яны займаюцца фарсіфікацыйным абсталяваннем пазіцый, раёнаў і рубяжоў. Гэта ў іх кампетэнцыі ствараць сховішчы і агнявыя пазіцыі, капаць траншэі і акопы, майстраваць збудаванні для бяспечнага размяшчэння асабовага складу.

Але ў выпадку баявых дзеянняў, вядома, чакаць інжынераў ніхто не будзе. Выкапаць сабе акоп павінен умець кожны салдат. Ёсць нават спецыяльныя нарматывы. Напрыклад, на стварэнне акопа для стральбы лежачы вайсковец не павінен затраціць больш за 30 хвілін. Калі ж у акопе лепш знаходзіцца стоячы, то неабходна ўкласціся ў паўтары гадзіны.

Калі ж з акопам для сябе здольны справіцца любы салдат, то змайстраваць сховішча для ваеннай тэхнікі і ўзбраення не кожнаму па сілах. Падлічана, што адзін чалавек будзе капаць катлаван прыкладна 25 гадзін. Машына справіцца з гэтым за 20 хвілін. Таму на чалавечы рэсурс, асабліва падчас баявых дзеянняў, калі кожная хвіліна дарагая, разлічваць не прыходзіцца.

### ПАДМАНУЦЬ ПРАЦІЎНІКА

Часам няма і гэтых 20 хвілін. Але і ў такім выпадку ваенныя інжынеры знойдуць выйсце. Напрыклад, замаскіруюць і сябе, і ваенную тэхніку.

— Маскіроўкай займаюцца ўсе войскі, — тлумачыць **камандзір інжынерна-тэхнічнага батальёна маёр Дзяніс ВАСІЛЕВІЧ.** — Інжынерныя войскі звычайна маскіруюць найбольш складаныя, маштабныя і важныя аб'екты: напрыклад, пункты кіравання. Таксама могуць замаскіраваць ілжывыя пазіцыі, раёны і рубяжы. Для гэтага выкарыстоўваюцца спецыяльныя маскіровачныя камплекты, пры неабходнасці ажыццяўляецца адпаведная афарбоўка тэхнікі. Фарбавальная станцыя, змешчаная на базе машыны «ГАЗ-66», у любы момант можа выехаць у патрэбнае месца.

Навуковы прагрэс істотна паўплываў на сродкі маскіроўкі. Сёння маецца вялікая колькасць матэрыялаў, якія змяняюць і паглынаюць цеплавую энергію не толькі чалавека, а і тэхнікі. Сучасныя сродкі здольны змяніць нават яе радыёлакацыйны фон. Некалькі маніпуляцый — і праціўнік нават не западозрыць прысутнасці варожых сіл.

Будучых інжынераў яшчэ на курсанцкай лаўцы вучаць, як замаскіравацца так, каб распазнаць іх было немагчыма. Спецыялісты сакрэтамі не дзеляцца — ваенная тайна. Хоць ахвотна прызнаюцца, што найбольш эфектыўнымі сродкамі маскіроўкі па-ранейшаму застаюцца натуральныя матэрыялы.

### ЗЛУЧЫЦЬ ДВА БЕРАГІ

— Мой батальён адказвае за навядзенне паромных і маставых пераправ, маставых пераходаў, займаецца будаўніцтвам нізкаводных драўляных мастоў, ваенных дарог і калонных шляхоў, — расказвае **камандзір інжынернага дарожна-мостабудаўнічага батальёна падпалкоўнік Сяргей САМАРАКОЎСКІ.** — У мірны час, часцей за ўсё, мы ажыццяўляем навядзенне перапраў. Часта дапамагаем калгасам падчас разліву рэк. У 2013 годзе, напрыклад, пабудавалі два драўляныя масты ў Крупскім лясніцтве. Напрасткі паміж двума населенымі пунктамі — 40 кіламетраў. Узведзеныя масты скарацілі адлегласць у восем разоў. Сказаць, як гэта аблегчыла людзям жыццё, — не сказаць нічога. Але самае галоўнае, што на выпадак пажару або іншага бедства змяншаецца час прыбыцця



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Камандзір інжынернага дарожна-мостабудаўнічага батальёна падпалкоўнік Сяргей САМАРАКОЎСКІ і камандзір інжынерна-тэхнічнага батальёна маёр Дзяніс ВАСІЛЕВІЧ.

пахваліцца наяўнасцю бартавой тэхнікі. Такім чынам, вайскоўцы ўносяць і сваю лепту ў агульны каравай, а разам з тым удасканальваюць свае навыкі кіроўцаў.

І нават калі з-за прыроднай стыхіі ў хаце або кватэры знікне святло, на дапамогу таксама прыйдуць ваенныя інжынеры. Электрастанцыі магутнасцю 100 кВт, якія стаяць на ўзбраенні 7-га інжынернага палка, здольныя забяспечыць электраэнергіяй невялікі населены пункт, некалькі шматкватэрных жылых дамоў або аб'ектаў інфраструктуры.

### НЕБЯСПЕЧНЫ «ЎРАДЖАЙ»

Даводзіцца ваенным інжынерам і рызыкаваць. Мініраванне і размініраванне — таксама іх поле дзейнасці. Без справы сапёры 7-га інжынернага палка не бываюць ніколі. То ў тым, то ў іншым рэгіёне Беларусі нагадваюць аб сабе «падарункі» Вялікай Айчыннай вайны. Даводзіцца абясшкоджваць боепрыпасы і на палігонах пасля ваенных вучэнняў.

Летась сапёры вызвалілі ад непрыемных «падарункаў» 20 аб'ектаў. Пік іх дзейнасці прыпадае на вясну, калі небяспечныя прадметы знаходзяць падчас палявых работ, і восень, калі насельніцтва, ідучы ў лес па ягады і грыбы, знаходзіць іншы «ўраджай». У асноўным трапляюцца боепрыпасы часоў Вялікай Айчыннай вайны.

— Выязджаем на аб'ект, калі ёсць нават адна такая знаходка: у любым выпадку, гэта пагроза для жыцця, — расказвае **камандзір інжынерна-сапёрнага батальёна кадра Павел РУДЗЬКОЎ.** — Бывалі выпадкі, калі ў адным месцы знаходзілі і больш за сотню боепрыпасаў. Помніцца, як у 2014 годзе ў Докшыцкім раёне, у Бярэзінскім запаведніку, паднялі з зямлі 165 мінамётных мін калібру 81 міліметр. Пасля даведаліся, што на гэтым месцы размяшчаліся баявыя пазіцыі савецкіх войск: акопы, бліндажы відаць і сёння. Але, нягледзячы на даўніну тых падзей, боепрыпасы вельмі добра захаваліся і ў любы момант маглі абарваць камусьці жыццё...

Паміж жыццём і смерцю шораз знаходзяцца і сапёры. Як прызнаецца Павел, пачуццё страху ёсць заўсёды. «Калі гэтага пачуцця няма, то ў сапёрнай справе рабіць няма чаго, — перакананы вайсковец. — Бясстрашным людзям тут не месца! Толькі лепш, калі сапёры, як і дактары, будуць без працы».

Павел Рудзькоў служыць у палку ўжо дзявяты год. Прыйшоў сюды пасля заканчэння Ваеннай акадэміі. З будучай прафесіяй вызначыўся яшчэ ў школе. Толькі ў мінулым годзе ён асабіста абясшкодзіў 539 боепрыпасаў. Усяго на рахунку хлопца 1076 выбухованебяспечных рэчываў, а магчыма, столькі ж і выратаваных жыццяў. На парадным кіцелі афіцэра — абсалютна заслужаны знак «За размініраванне» II ступені.

Калі размініраванне — звычайная практыка для сапёраў, то ў мірны час мініраванне адбываецца толькі ў мэтах навучання асабовага складу. Але, як той казаў, у кожным правіле ёсць выключэнні. І адным з іх з'яўляецца наўмысны падрыў аб'ектаў. Праўда, з такімі просьбамі да ваенных інжынераў звяртаюцца даволі рэдка. І, як прызнаюцца спецыялісты, замініраваць аб'ект значна складаней, чым яго размініраваць. Перш, чым узарваць пэўны аб'ект, трэба правесці спецыяльныя разлікі, падрыхтаваць месцы кладкі, закласці боепрыпасы — і толькі потым яго падрываць. Часам на гэта патрабуецца не адзін дзень.

### ПАДВОДНЫЯ ІНЖЫНЕРЫ

«Падарункі» Вялікай Айчыннай вайны часам сустракаюцца і ў вадаёмах. Тут на дапамогу сапёрам прыходзяць ваенныя вадалазы. Яны абавязкова прысутнічаюць і пры абкатцы танкаў праз вадаёмы. Раптам машына заглухне або ўвогуле выйдзе са строю? У такім выпадку на дапамогу ім прыйдуць інжынеры ў вадалазных касцюмах. Любыя пошукавыя мерапрыемствы пад вадой — таксама ў іх кампетэнцыі.

Уражвае рыштунак вадалазаў. Цалкам такі камплект важыць 82 кілаграмы. Толькі адны галошы — 16-кілаграмовыя! Касцюм апранаецца з дапамогай 2 чалавек.

— Гэты рыштунак прызначаны для апускання на вялікія глыбіні, — уводзіць у курс справы **камандзір разведвальна-вадалазнага ўзвода лейтэнант Арцём ШАУРА.** — У ім можна апускацца да 60 метраў, у экстранных выпадках — да 80, але на непрацяглы час. Прызначаны касцюм яшчэ і для нізкіх тэмператур. Зімой апусціцца пад лёд у ім будзе камфортна. Ды і пад вадой у такой экіпіроўцы перасоўвацца нашмат лягчэй: ніякім цячэннем цябе не знясе. Вядома, ёсць на ўзбраенні палка і больш сучасныя вадалазныя касцюмы.

У такім рыштунку, які важыць 82 кілаграмы, ваенныя вадалазы апускаюцца пад ваду.

### З ВОЙСКА — З ДЫПЛОМАМ

Салдаты тэрміновай службы спасцігаюць азы ваеннай інжынерыі не толькі ў аўдыторыях і майстэрнях. Яны актыўныя ўдзельнікі ўсіх акцый і мерапрыемстваў, у якіх задзейнічаны інжынерныя войскі. Са старэйшымі таварышамі па службе вайскоўцы ўзводзяць масты, будуюць дарогі, перавозяць збожжа і вызваляюць ад снегу аўтамабільныя магістралі. Ім, учарашнім прызыўнікам, давяраюць велікагрузную і спецыяльную тэхніку.

**На стварэнне акопа для стральбы лежачы вайсковец не павінен затраціць больш за 30 хвілін. Калі ж у акопе лепш знаходзіцца стоячы, то неабходна ўкласціся ў паўтары гадзіны.**

— Калі ў салдата няма правоў кіроўцы адпаведнай катэгорыі, то атрымаць іх ён мае магчымасць у арміі, — расказвае Дзяніс Васілевіч. — Вучым кіраваць і грузавой машынай з прычэпам, і аўтобусам. Толькі на самалёт правы не выдаём! *(Смяецца.)* Не маючы ніякіх навыкаў, у войску салдат таксама можа атрымаць як спецыяльнасць экскаватаршчыка, так і кранаўшчыка. Многія застаюцца ў нас па кантракце і працягваюць службу ў званні прапаршчыкаў. Або звальняюцца і на грамадзянцы ўладкоўваюцца кіроўцамі аўтатранспарту. Практычна ўсе спецыяльнасці, атрыманыя ў інжынерных войсках, запатрабаваныя ў грамадзянскім жыцці.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

Павел РУДЗЬКОЎ за час службы асабіста абясшкодзіў 1076 боепрыпасаў.

тэхнікі для выратавання людзей, жывёл і прыроды.

Масты, пабудаваныя ваеннымі інжынерамі, стаяць не дзень і не два, нават не год. Яны служаць дзесяцігоддзямі і часам здольныя прапусціць машыны грузападымальнасцю да 60 тон.

### «ХУТКАЯ ДАПАМОГА» ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

Але не толькі мастамі і пераправамі воіны-інжынеры карысныя цывільнаму насельніцтву. Сваю ўніверсальнасць яны змаглі даказаць літаральна на днях, калі краіну засыпала снегам. Інжынерная тэхніка, як і тры гады таму падчас «Хаўера», з лёгкасцю ліквідавала наступствы магутных цыклонаў на дарогах Міншчыны.

Спраўляюцца вайскоўцы і з наступствамі іншых стыхій. «Два гады таму мы ўдзельнічалі ў культывацыі ляснога масіву пасля ўрагану ў Крупскім раёне, — гаворыць Сяргей Самаракоўскі. — А яшчэ раней, калі рака Бярэзіна была суднаходнай, эвакуявалі з яе патанулую баржу. За гэта не бралася нават МНС!»

Штогод інжынерную тэхніку можна ўбачыць і на жніве. Воіны-інжынеры дапамагаюць сельскай гаспадарцы ў розных рэгіёнах краіны: звычайна ў тых калгасах, якія не могуць

■ Унікальнае падраздзяленне

# МАЙСТРЫ ДАРОЖНЫХ КАМУНІКАЦЫЙ

## Спецыялісты транспартных войскаў — каштоўныя кадры і ў грамадзянскім жыцці

**Калі краіну параўноўваць з арганізмам чалавека, то сардэчна-сасудзістая сістэма ў ёй — транспартныя камунікацыі. Быццам венамі і артэрыямі, Беларусь пранізана чыгуначнымі і аўтамабільнымі магістралямі. Транспартныя камунікацыі злучаюць гарады і вёскі, дзяржавы, нават кантыненты. Выкарыстоўваючы іх у сваіх мэтах, людзі ў пагонах уносяць важкі ўклад і ў развіццё сельскай гаспадаркі, абарончага сектара эканомікі, дапамагаюць насельніцтву вырашаць надзённыя праблемы.**

**Як цэласная сістэма транспартныя войскі Беларусі маюць небагатую гісторыю: яны былі створаны ў маі 2006 года на базе чыгуначных і аўтамабільных войскаў. Але і за гэты час зроблена нямала. Якімі буйнымі аб'ектамі мы абавязаны воінам-дарожнікам, чаму без гэтых спецыялістаў нельга ўявіць ніводзін узброены канфлікт і чым яны карысныя краіне ў мірны час — пра гэта і іншае мы пагутарылі з начальнікам дэпартамента транспартнага забеспячэння Міністэрства абароны генерал-маёрам Сяргеем НОВІКАВЫМ.**

***— Сяргей Ігнатавіч, стварэнне транспартных войскаў Рэспублікі Беларусь злучыла шматлікія віды камунікацый. Ці апраўдалася рашэнне аб'яднаць у адзіную сістэму чыгуначныя, аўтамабільныя і дарожныя войскі?***

— Вывучаючы вопыт войнаў і ваенных канфліктаў, мы ўзялі лепшае, стварыўшы сістэму транспартнай бяспекі, у якую ўваходзяць чыгуначныя, аўтамабільныя і дарожныя войскі. Асноўным патэнцыялам транспартных войскаў з'яўляюцца падраздзяленні і воінскія часці, прызначаныя для гарантаванай аховы, тэхнічнага прыкрыцця, пры неабходнасці — аднаўленя і забеспячэння эфектыўнага функцыянавання транспартных камунікацый, найперш, штучных збудаванняў рознага прызначэння. Адзіная структура сістэмы транспартнага забеспячэння ўжо пацвердзіла сваю эфектыўнасць — як тая, якая адказвае сучасным рэаліям і здольная вырашаць увесь спектр надзённых пытанняў як у мірны, так і ў ваенны час. Стварыўшы ўнікальную ўніверсальную і цэласную сістэму, мы адаптавалі яе не толькі для Узброеных Сіл, а і для забеспячэння транспартнай бяспекі іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў, у цэлым нашай дзяржавы.

***— Найбуйнейшыя аперацыі Вялікай Айчыннай вайны не маглі абысціся без чыгуначнага транспарту, аўтамабільныя магістралі звязвалі фронт з тылам, а знакамітая дарога жыцця праз Ладажскае возера ўратавала не адну сотню тысяч чалавек... Якое месца транспартным камунікацыям адводзіцца ў сучасных узброеных канфліктах?***

— Сапраўды, ніводная буйная аперацыя, якая праводзілася ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ва ўзброеных канфліктах сучаснасці, не магла абысціся без удзелу як чыгуначных, так аўтамабільных і дарожных войскаў. Напрыклад, падчас аперацыі «Баграціён», у выніку якой Беларусь была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, сіламі транспартнага забеспячэння быў гарантаваны надзейны падвоз матэрыяльных сродкаў. У гэтым заслуга і 13 асобных чыгуначных брыгад, і аўтамабілістаў, якія перавезлі звыш мільёна тон разнастайных грузаў для дзейнай арміі. Асобныя часці, якія ўваходзяць у склад транспартных войскаў Рэспублікі Беларусь, — 30-я асобная Чырванасцяжная чыгуначная брыгада, 71-ы асобны пуцявы чыгуначны батальён і 77-ы асобны Чырванасцяжны маставы чыгуначны батальён — прайшлі вайну з першага па апошні дзень, зрабілі ўсё дзеля таго, каб савецкія войскі дайшлі да Германіі і заваявалі Перамогу.

Сёння роля транспартных войскаў у забеспячэнні транспартнай бяспекі ўзрасла шматкроць. Цяжка нават уявіць, што пэўная аперацыя будзе праведзена без адпаведнай тэхнікі, зброі, іншых матэрыяльных сродкаў і, вядома, транспартнай інфраструктуры. Мы забяспечваем жывучасць чыгуначных і аўтамабільных дарог, здольныя захоўваць і аднаўляць працаздольнасць транспартных камунікацый нават ва ўмовах дзеяння праціўніка, ажыццяўляць вайсковыя перавозкі.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

■ Боегатоўнасць

# ІСПЫТ НА АБАРАНАЗДОЛЬНАСЦЬ

## Ва Узброеных Сілах працягваецца комплексная праверка гатоўнасці і здольнасці злучэнняў і вайсковых часцей выконваць задачы па прызначэнні

Напрыклад, падраздзяленні 11-й механізаванай брыгады пераадолелі водную перашкоду, раку Нёман, па пераправе, створанай ва ўмовах суцэльнага ледзянога покрыва. Маставая пераправа ў кароткі тэрмін была наведзена вайскоўцамі пантонна-маставога батальёна 557-й інжынернай брыгады з дапамогай спецыялістаў са 188-й гвардзейскай інжынернай брыгады і 7-га інжынернага палка.

У воінскіх падраздзяленнях, у якіх ажыццяўляецца праверка, працягваецца прызыў ваеннаабавязаных, праводзяцца заняткі па прадметах баявой падрыхтоўкі, адбываецца рэкагнасцыроўка раёнаў правядзення тактычных вучэнняў, камбінаваным спосабам здзяйсняюцца маршы ў раёны прызначэння, дзе адбудуцца мерапрыемствы баявога згладжвання і тактычныя вучэнні, у тым ліку з баявой стральбой.

Значная ўвага надаецца праверцы гатоўнасці ўзбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі па баявым прымяненні ў розных абставінах, у тым ліку пры нізкіх тэмпературах. У поўным аб'ёме ажыццяўляецца матэрыяльнае забеспячэнне воінскіх часцей і падраздзяленняў, якія выконваюць пастаўленыя задачы. Арганізаваны пункты абагрэву асабовага складу.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

■ Без тэрміну даўнасці

# ЗАБЫТЫ ДЗОТ

## І дагэтуль невядома, ці маюць магілу партызаны, якія загінулі падчас баёў на Дняпроўска-Бугскім канале

**У гісторыю партызанскага руху Беларусі баявыя дзеянні партызанаў у паўднёвай частцы Брэсцкай і былой Пінскай абласцей у лютым — сакавіку 1944 года ўвайшлі як 40-дзённая абарона Дняпроўска-Бугскага канала. Партызанская вайна прыняла тут формы сапраўднага фронту, з уласцівымі яму дзотамі і акопамі. Вывучаючы дакументы Нацыянальнага архіва, давялося аднавіць забытыя старонкі тых трагічных і разам з тым гераічных дзён.**

На пачатку лютага 1944 года Чырвоная Армія вызваліла Роўна і Луцк. Пачаліся жорсткія баі за Ковель. Савецкія войскі, не сустракаючы вялікага супраціўлення, хутка прасоўваліся наперад па забалочаных тэрыторыях уздоўж правага берага Прыпяці. Яны маглі злучыцца з партызанамі, якія фактычна займалі тэрыторыю паміж Дняпроўска-Бугскім каналам і левым берагам Прыпяці, і апынуцца ў тыле 2-й нямецкай арміі, перарэзаўшы жалезную і шашэйную дарогі з Лунінца ў Брэст, па якіх забяспечваўся фронт. Але нямецкае камандаванне паставіла задачу ачысціць гэтую тэрыторыю ад партызанаў, знішчыць партызанскі аэрадром каля Сварыні і замацавацца на рацэ.

### Лінія абароны

У наступленне супраць народных мсціўцаў немцы кінулі корпус групы войск «Агрыкола», куды ўваходзілі 23-я венгерская пяхотная дывізія і кавалерыйскі полк уласаўцаў. Пра тое, што немцы паспрабуюць выціснуць партызанаў з паўднёвай зоны Брэсцкай і Пінскай абласцей, партызанскае камандаванне даведалася яшчэ ў снежні 1943 года. Таму пачалі ствараць лінію абароны.

У выніку правядзення партызанскай аперацыі ў чэрвені 1943 года канал быў выведзены з эксплуатацыі. Партызаны брыгады імя Молатава Пінскага партызанскага злучэння пад камандаваннем Міхаіла Герасімава знішчылі шлюзы ў Оўзічах, Ляхавічах, Селішчы, Перарубе і Рагадошчы. Канал заставаўся толькі натуральнай перашкодай для наступлення ворага.

### Поспех герасімаўцаў

У дваццатых чыслах лютага акупанты пачалі рух у напрамку канала. У цэнтры партызанскай абароны, на самым адказным участку, размясціліся народныя мсціўцы брыгады імя Молатава. Гэтая брыгада лічылася адной з самых баявых у Пінскім партызанскім злучэнні, а камбрыг Міхаіл Герасімаў быў любімцам камандзіра злучэння Васіля Каржа. Нават быў прадстаўлены ім да звання Героя Савецкага Саюза, але ўзнагароду так і не атрымаў.

«...40 дзён брыгада трымала абарону на Дняпроўска-Бугскім канале супраць пераўзыходзячых сіл немцаў, — паведамляецца ў характарыстыцы на Міхаіла Герасімава. — Байцы і камандзіры праявілі вялікую адвагу і вытрымку. Усімі дзеянямі брыгады кіраваў Герасімаў. Байцы заўсёды бачылі яго на самых адказных участках. Ніводны катар і баржа не прайшлі па канале — усе яны сталі трафеямі надыходзячай арміі. У Пінску было захоплена арміяй 170 адзінак рачных катараў і баржаў...».

### На шляху — канал

Атрад імя Калініна брыгады імя Молатава заняў абарону ў раёне дарогі Белін — Мукашын, кантралюючы пераправу ля спаленага моста цераз Дняпроўска-Бугскі канал. Партызаны да абароны падрыхтаваліся загадзя. З дапамогай мясцовага насельніцтва пабудавалі на найболей адказных участках дзоты, дзе да пачатку лютага ўжо неслі баявое дзяжурства.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*